Гарошка А.

# ГЕРОЙ САВЕЦКАГА САЮЗА ВАСІЛЬ ЦЕМЧУК

Восеньскія дажджы размылі дарогі. Камякі глею наліпалі на боты. Колы гармат рэзалі глыбокую каляю. Кожны крок каштаваў вялікіх намаганняў. Але салдаты забывалі аб стомленасці. Паспяховае наступленне к Дняпру выклікала незвычайнае натхненне ў савецкіх воінаў.

Вялікі шлях прайшлі войскі Варонежскага фронта ад Белграда. Сонца свабоды зазззяла над Сумамі, Рамнамі, Прылукамі і іншымі гарадамі і вёскамі. А наперадзе Кіеў. Ва ўсіх было адно імкненне – гнаць, гнаць ворага з роднай зямлі, не даць праціўніку замацавацца на правым беразе Дняпра, з ходу фарсіраваць гэтую водную перашкоду, захапіць плацдарм для далейшага наступлення.

Фашысцкае камандаванне на вялікі ўчастак пад Кіевам падцягнула 19-ю танкавую, 10-ю матарызаваную і некалькі пяхотных дывізій. Разгарэліся гарачыя баі не толькі на зямлі, але і ў паветры. Групы нямецкіх самалётаў чацвёртага паветранага флоту па 40-50 у кожнай, дзень і ноч віселі над нашымі пазіцыямі. Савецкія зенітчыкі смела адбівалі атакі паветраных піратаў. Кожны налёт дорага каштаваў ворагу. Чорныя шлейфы дыму пылаючых самалётаў раз за разам праразалі ўкраінскае неба.

Сярод герояў-зенітчыкаў быў і наш зямляк Васіль Іванавіч Цемчук. Для яго былі аднолькава дарагія і зялёныя бары беларускіх лясоў, і блакітнае неба Украіны. Яго дзяцінства прайшло ў вёсцы Дзедава, дзе ён нарадзіўся ў 1920 годзе, а потым на станцыі Тошчыца, куды ляснымі сцяжынкамі бегаў у школу. Пах піянерскіх кастроў на Быхаўшчыне перамешваўся ў Васіля з пахам шахтных капроў Данбаса. Тут пачалося і было перарвана вайной яго юнацтва. У першыя ж дні вайны Васіль Цемчук атрымаў зброю і стаў байцом Паўднёвага, а затым Варонежскага фронту.

Даўно змянілася нягода суровай часіны адступлення радасцю вялікіх перамог пад Масквой, на Волзе, пад Курскам і Белградам. Грудзі Васіля ўпрыгожыла медаль "За баявыя заслугі", якую ён атрымаў за знішчаны 20 сакавіка 1943 года фашысцкі сцярвятнік "Ю-88".

У час летняга наступлення зенітны разлік 4 батарэі, у які ўваходзіў Васіль Цемчук, давёў баявы лік да пяці знішчаных нямецкіх самалётаў.

Нашы войскі рыхтаваліся адзначыць 26-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка вызваленнем сталіцы братняй рэспублікі – Кіева. Неспакойна было ў гэты час на Букрынскім плацдарме паўднёвей Кіева. Узмацніліся налёты фашысцкай авіяцыі на пераправы і невялікі

плацдарм. Нашы зенітчыкі вялі смяротныя сутычкі з паветранымі сцярвятнікамі. 22 кастрычніка 27 пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў "Ю-87" наляцелі на агнявую пазіцыю зенітнай батарэі. Зямля дрыжэла ад разрываў бомб, радзелі рады артылерыстаў. Камсамолец-яфрэйтар Васіль Іванавіч Цемчук бясстрашна адбіваў атакі паветраных піратаў і да апошняй мінуты свайго жыцця, пакуль асколак варожага снарада не трапіў у героя-зенітчыка, не пакідаў баявы пост. Подзвіг камсамольца натхняў артылерыстаў, клікаў на смяротны бой з фашыстамі.

Напярэдадні 26-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі – 6 лістапада сталіца нашай Радзімы Масква громам гарматнага салюта абвясціла ўсяму свету аб вызваленні Кіева – сталіцы Савецкай Украіны. У гэты дзень восеньскае маскоўскае неба расквецілася яркімі агнямі рознакаляровых ракет. Гэта быў салют бессмяротным героям, аддаўшым сваё жыццё за перамогу.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 снежня 1943 года Васілю Іванавічу Цемчуку пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Імя яго назаўсёды захаваецца ў памяці яго землякоў.

**Гарошка, А. Герой Савецкага Саюза Васіль Цемчук / А. Гарошка // Маяк Прыдняпроўя (Быхаў). — 1967. — 25 красавіка. — С. 3.**